УДК 378.06-057.875-058.833

Т. У. Жукоўская, выкладчык (БДТУ)

# ФАРМАВАННЕ КУЛЬТУРЫ СЯМЕЙНЫХ АДНОСІН У СТУДЭНЦКІМ АСЯРОДКУ

У артыкуле падымаюцца пытанні фармавання культуры сямейных адносін у студэнцкім асяродку. Раскрываецца сістэмны і мэтанакіраваны характар выхаваўчай працы кафедры беларускай мовы па прапагандзе сямейных каштоўнасцей і прафілактычных мер па захаванні сям'і. Даецца вывад, што толькі адзінства дзеянняў адукацыйнай і выхаваўчай сістэмы, пры якой студэнты атрымліваюць аднолькавыя ўяўленні і маральныя ўстаноўкі, можа даць станоўчы эфект.

The article dwells on the problems of family relations in student environment. The author highlights the systematic and dedicated character of educational work al the Belarusian language department aimed at popularising of family values and stable family relations. The anther comes to conclusion that positive results of the educational work can be obtained only in case of united action of the learning and education system, within the bounds of which students get identical ideas and faiths.

**Уводзіны.** Ва ўсе эпохі і пры ўсіх сацыяльна-эканамічных фармацыях і палітычных сістэмах выхаванне моладзі ў большай або меншай ступені ўвязвалася ў першую чаргу з інтарэсамі грамадства. А гэта прывяло да стварэння адпаведных грамадска-дзяржаўных выхаваўчых структур. Ім належыць важная роля ў фармаванні падрастаючага пакалення. Яна заключаецца ў адзінстве адукацыйнай і выхаваўчай сістэмы, пры якой усе юныя грамадзяне атрымліваюць аднолькавыя грамадскія і маральныя ўстаноўкі, што вызначаюць асноўныя іх уяўленні аб сямейных каштоўнасцях.

Сям'і і шлюбу ў наш час удзяляецца вялікая ўвага вучоных: сацыёлагаў і дэмографаў, эканамістаў і этнографаў, псіхолагаў, медыкаў, юрыстаў і выкладчыкаў. Прычына такой вялікай увагі заключаецца ў тым, што інстытут сям'і мае жыццёва важнае значэнне як для асобных індывідаў, так і для ўсяго грамадства. Праблемы, якія выкліканы нестабільнасцю сямей, зараз як ніколі з'яўляюцца актуальнымі і надзённымі для нашага грамадства. Наступствы гэтых тэндэнцый і з'яў уяўляюць сабой патэнцыяльную пагрозу як сацыяльна-дэмаграфічнага і эканамічнага, так і этыка-псіхалагічнага плана. У гэтай сітуацыі неабходна інтэнсіфікацыя мер як дзяржаўнага ўзроўню, так і прыватнага. Праблемы стварэння шчаслівай сям'і, падрыхтоўкі моладзі да сямейнага жыцця і звязаныя з імі пытанні з'яўляюцца вельмі актуальнымі для навучальных устаноў.

Адной з прыярытэтных задач, якія ставіць наша дзяржава на сваім шляху да сацыяльна-эканамічнага прагрэсу, з'яўляецца фармаванне культуры сямейных адносін, павышэнне бацькоўскай адказнасці за выхаванне дзяцей, захаванне і ўмацаванне сямейных каштоўнасцей. Сведчаннем таму стала прыняцце Нацыянальнай праграмы дэмаграфічнай бяспекі Рэспублікі Беларусь на 2007–2010 гг., зацверджанай Прэзідэнтам Рэспублікі Беларусь 26 сакавіка 2006 г. [1].

**Асноўная частка.** З мэтай уплыву педагагічных установак на ўяўленне аб будучай сям'і ў студэнцкім асяроддзі арганізавана выхаваўчая праца кафедры, задачамі якой з'яўляецца вывучэнне бацькоўскіх адносін (установак) у сямейных узаемадзеяннях; фармаванне ўстановак і сямейных каштоўнасцей у студэнцкай моладзі на мяркуемыя сямейныя ролі; аказанне ўплыву пасродкам выхаваўчых мерапрыемстваў (гутаркі, дыспуты, складанне радаводаў, стварэнне праектаў і інш.).

Падкрэслім, што сямейнае права рэгулюе найбольш істотныя адносіны ў сям'і, але, тым не менш, у нашай краіне распадаецца кожная другая сям'я. Штогод адмаўляюцца ад наваро-джаных каля 500 жанчын. Па-за шлюбам нараджаюцца каля 8 тыс. дзяцей, з іх больш за 300 – у непаўналетніх, якія яшчэ самі маюць патрэбу ў апецы [2].

Выкладчыцкі калектыў кафедры беларускай мовы БДТУ прыкладае ўсе намаганні, каб прафілактычныя захады па ахове сям'і і прапагандзе сямейных каштоўнасцей набылі сістэмны і мэтанакіраваны характар.

Вядома, што сямейныя каштоўнасці на працягу стагоддзяў былі тым стрыжнем, на якім трымалася развіццё і дабрабыт кожнай дзяржа-

вы. Менавіта сям'я як асноўная ячэйка грамадства дазваляе выстаяць беларускаму народу ў цяжкіх выпрабаваннях і замацаваць поспехі ў спрыяльны перыяд. І, наадварот, адмоўныя дэмаграфічныя змены ў жыцці любой краіны прыводзяць да самых негатыўных наступстваў і ў далёкай перспектыве могуць ставіць пад пагрозу існаванне дзяржавы. Таму прадбачлівая выхаваўчая праца, якая праводзіцца выкладчыкамі ў гэтым накірунку, – гэта тая трывалая апора, на якой ужо заўтра будзе будавацца дабрабыт і росквіт мірнай і працавітай беларускай сям'і.

У выхаваўчым працэсе павінны быць узгоднены дзеянні як сям'і, так і навучальнай установы. Калі ж няма такой узгодненасці, тады студэнты, як правіла, займаюць найбольш выгадную для сябе пазіцыю. У выніку атрымліваецца малаэфектыўны працэс.

Правільна спланаваныя мерапрыемствы кафедры па фармаванні сямейных адносін даюць вялікія магчымасці мэтанакіраванага і актыўнага ўздзеяння на свядомасць і паводзіны студэнтаў. Вядома, што і ў сям'і малады чалавек атрымлівае шмат разнастайнай інфармацыі, звязанай з пытаннямі маральнасці. Бацькі часцей за ўсё заводзяць з імі гутаркі пра вучобу і дысцыпліну, пра іх адносіны да выкладчыкаў, старэйшых, аднакурснікаў, разважаюць пра многія надзённыя бытавыя і грамадскія праблемы, пра ўменне жыць у сучасных умовах, пра значымасць працы ў чалавечай дзейнасці, выбары прафесіі, удзеле ў грамадскіх справах. Думаецца, што такія ўсебаковыя падыходы да вырашэння пастаўленых задач дадуць станоўчы вынік. Пры гэтым неабходна зазначыць, што інфармацыя студэнтамі ўспрымаецца і засвойваецца часцей за ўсё выбарачна. Гэта звязана як з уплывам сферы зносін па-за сям'ёй, групай, так і з асабістымі якасцямі маладога чалавека, у прыватнасці, з наяўнасцю ў яго крытычнага мыслення. Таму ўсе свае зносіны выкладчык павінен будаваць **дыферэнцавана**. Пры гэтым важна ўлічваць узроставыя і індывідуальныя псіхалагічныя асаблівасці студэнтаў, узровень іх выхаванасці, ступень эмацыянальнай настроенасці і многае іншае.

Зыходзячы з практыкі сямейнага выхавання, можна выдзеліць шэраг псіхолага-педагагічных умоў, пры захаванні якіх дзейнасць выкладчыка будзе найбольш эфектыўнай. У першую чаргу трэба адзначыць **добразычлівасць**. Ва ўзаемаадносінах са студэнтамі павінны ўлічвацца таксама іх узроставыя і індывідуальныя асаблівасці. Звычайна першакурснікі ў сваім узросце ўжо дасягаюць фізічнай і псіхалагічнай сталасці. Аднак і ў гэтым узросце ёсць свае супярэчнасці і цяжкасці. У адрозненне ад падлеткаў, якія прад'яўляюць высокія патрабаванні да людзей і не вельмі патрабавальныя да сябе, першакурснікі больш крытычна адносяцца як да іншых, так і да сябе. У іх на аснове маральных ведаў і жыццёвага вопыту ўжо выпрацаваны пэўныя ўстойлівыя погляды, перакананні і прынцыпы. І тут выкладчык павінен аказваць уплыў не толькі на іх інтэлектуальную, але і **эмацыянальную** сферу. Пачуцці студэнтаў мяняюцца, калі яны чымсьці захапляюцца, калі закранаецца іх эмацыянальны бок. Таму неабходна часцей звяртацца да эмацыянальных пачуццяў, уздзейнічаць на іх.

У выніку студэнты будуць не толькі аб чымсьці задумвацца, але і хвалявацца, перажываць і лепш засвойваць інфармацыю, актыўна ўдзельнічаць у мерапрыемствах, праяўляць сваю творчасць.

Важная роля ў выхаванні сямейных адносін адводзіцца выкладчыцкаму аўтарытэту. Галоўная ўмова аўтарытэту выкладчыка (куратара) – яго высокамаральныя паводзіны і ўчынкі. Акрамя гэтага, выкладчык павінен валодаць тактам і этыкай зносін са студэнтамі. Неабходна захоўваць пачуццё меры, улічваць іх індывідуальныя асаблівасці, душэўны стан, канкрэтныя ўмовы і сітуацыі. Выкладчыцкае слова – надзвычай далікатны інструмент уздзеяння на маладога чалавека. Грубасць, бестактоўнасць, неэтычнасць могуць прывесці да з'яўлення ў паводзінах студэнта гэтых жа якасцей.

На прыкладзе адной з куратарскіх груп можна прасачыць, як на працягу чатырох гадоў фарміраваліся погляды на сямейныя адносіны, уяўленні аб будучай сям'і, устаноўкі на сямейныя каштоўнасці. Выкарыстоўваючы шырокі спектр мерапрыемстваў, якія былі скіраваны на ўяўленне юнакоў і дзяўчат аб асноўных функцыях сям'і, сямейных каштоўнасцях, асобаснай супольнасці мужа і жонкі, бацькоўскіх абавязках, маральнай і эмацыянальнай падтрымцы, значнасці ў сямейным жыцці сексуальных адносін, прафесійных інтарэсах кожнага з сужэнцаў, жадаемым размеркаванні ролей паміж мужам і жонкай пры рэалізацыі сямейных функцый, прыйшлі да высновы, што амаль ва ўсіх навучэнцаў склаліся ўстойлівыя станоўчыя погляды на будучую сям'ю. Заўважым, што ў групе з 28 чалавек у 10 студэнтаў – няпоўныя сем'і. У выхаваўчым працэсе выкарыстоўваліся розныя формы дзейнасці: гутаркі, дэбаты, анкетаванне, рэферыраванне (падрыхтоўка тэматычных дакладаў), відэагадзіны (прагляд мастацкіх кінастужак па вызначанай тэматыцы на базе Музея гісторыі беларускага кіно), складанне радаводаў, творчых праектаў, музейна-экскурсійныя заняткі па тэме «Роля жанчыны ў гісторыі Беларусі»; сустрэчы з прадстаўнікамі сямейных дынастый, з юрыстамі, медыкамі і г. д.

Пры правядзенні анкетавання на выяўленне сямейных каштоўнасцей у юнакоў і дзяўчат [3] было выяўлена, што каханне з’яўляецца асноўным параметрам пабудовы сямейных адносін і фундаментам сям’і, на другім месцы знаходзіцца агульнасць інтарэсаў мужа і жонкі. Большасць студэнтаў выказаліся за сям’ю як сферу эмацыянальнай разрадкі. Што датычыцца знешняй прывабнасці сужэнцаў, то большасць студэнтаў лічаць гэта не самым галоўным ў сямейных адносінах. Даволі шмат студэнтаў выказаліся за высокі ўзровень дабрабыту сям’і.

Такім чынам, шлюбна-сямейныя каштоўнасці ў юнацкім узросце вызначаюцца даволі высокай ступенню маральна-этычнай накіраванасці.

Як прыклад дзейнасці калектыву кафедры ў гэтым накірунку, ім створаны дзеючы праект «Сям’і маёй пачатак», задачы якога заключаюцца ў наступным: фарміраванне культуры сямейных адносін; фарміраванне ў моладзі ўстановак здаровага ладу жыцця; падтрымка сям’і і яе ўмацаванне; павышэнне ролі сям’і і яе прэстыжу ў грамадстве; умацаванне маральных асноў сям’і; павышэнне культуры шлюбна-сямейных адносін; папярэджанне і вырашэнне праблем сямейных узаемадачыненняў; умацаванне маральных асноў сям’і; выкарыстанне творчых даследаванняў студэнтаў у вучэбна-выхаваўчым працэсе; інфармаванасць студэнтаў па пытаннях, якія звязаны з фарміраваннем сям’і, унутрысямейных адносін. На аснове гістарычных і музейных дакументаў-сведчанняў традыцыйнай сямейнай абраднасці, запісаў захавальнікаў сямейных традыцый даследаваны стан сямейных адносін у гістарычным і сучасным аспектах, створаны навуковыя і творчыя працы, радаводы, якія прадстаўляліся на конкурсах розных ўзроўняў і былі адзначаны высокімі ўзнагародамі, падрыхтаваны выставачны матэрыял для ўніверсітэцкіх і рэспубліканскіх выстаў і г. д. Студэнцкія навукова-творчыя працы прэзентаваны ў студэнцкіх вучэбных і куратарскіх групах, матэрыял навукова-творчых прац выкарыстаны ў выступленнях валанцёрскіх груп. Матэрыял праекта можа быць выкарыстаны для самастойнага вывучэння традыцый і абрадаў беларускай сям’і, а таксама пры правядзенні заняткаў па беларускай і рускай мовах, куратарскіх гадзін, у выступленнях фальклорных гуртоў і валанцёрскіх груп, пры мадэляванні сучаснага вяселля.

Немалаважную ролю ў выхаваўчым працэсе адыгрывалі такія яго складнікі, як народная педагогіка, вусная народная творчасць. Фальклор заўсёды нёс магутны маральна-этычны патэнцыял, апяваючы высокапаэтычныя адносіны паміж людзьмі: у сям’і, сяброўстве, грамадстве ў цэлым. Мэтай уключэння ў змест мерапрыемстваў беларускага фальклору з’яўляўся разгляд сацыяльных і маральна-нораўных падыходаў да павышэння ўзроўню правіл існавання сучаснай сям’і.

На працягу стагоддзяў сям’я для беларуса была адзінай крэпасцю, якая ахоўвала яго ўласнае жыццё і забяспечвала працяг роду, стварала дабрабыт і зарабляла людскую пашану. У беларускім фальклоры ўвогуле, пазаабрадавай паэзіі перш за ўсё, па-мастацку распрацоўваецца тэма сям’і: міжасобасныя ўнутрысямейныя дачыненні, лёс замужняй жанчыны і г. д. Пры карыстанні вуснымі паэтычнымі творамі студэнты ў сваіх даследчых навуковых і творчых працах звяртаюць увагу не толькі на этнічную і гістарычную інфармацыйную значнасць фальклорнага матэрыялу, але на той высокі маральна-нораўны і этычны патэнцыял, які ён нясе для сучаснай моладзі. Праз мастацкае народнае слова да нас вяртаюцца мудрасць, мараль, гуманістычныя погляды народа на міжасобасныя сямейныя адносіны.

Сацыяльны, маёмасны, грамадскі стан сям’і, сямейныя звычаі і традыцыі, якія складаліся на працягу вякоў, здольнасць ці няздольнасць кожнага зберагчы каханне, якое аб’яднала іх у сям’ю, – вось далёка не поўны пералік тых фактараў, што ўплываюць ў большай ці меншай ступені на фармаванне такога ўсімі жаданага і такога няпэўнага сямейнага шчасця.

**Заключэнне.** Такім чынам, у поглядах студэнтаў на жыццядзейнасць сучаснай сям’і першаснае значэнне набываюць функцыі, якія звязаны са зносінамі, узаемадапамогай, эмацыянальнымі адносінамі мужа і жонкі, бацькоў і дзяцей. Пры гэтым асабліва важнае значэнне і вялікі ўплыў аказваюць погляды і ўстаноўкі бацькоў і выкладчыкаў на ўяўленне моладзі на пабудову сваёй сям’і і сістэмы сужэнцкіх і дзіцяча-бацькоўскіх адносін. Толькі адзінства дзеянняў адукацыйнай і выхаваўчай сістэмы, пры якой студэнты атрымліваюць аднолькавыя ўяўленні аб сямейных каштоўнасцях і маральныя ўстаноўкі на іх захаванне, можа даць станоўчыя вынікі.

## Літаратура

1. Варюхина, С. И. Истоки доброты: Беседы о нравственном воспитании детей в семье / С. И. Варюхина. – Минск: Полымя, 1987. – 128 с.

2. Гребенников, И. В. Основы семейной жизни: учеб. пособие / И. В. Гребенников. – М.: Просвещение, 1991. – 158 с.

3. Ковалев, С. В. Подготовка старшеклассников к семейной жизни: тесты, опросники, ролевые игры: кн. для учителей / С. В. Ковалев. – М.: Просвещение, 1993. – 143 с.

*Паступіў 02.04.2010*